## Навагодняе мерапрыемства
## у аддзяленні дзённага знаходжання
## для грамадзян пажылога ўзросту

27 снежня 2018 года ў аддзяленні дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" прайшоў святочны навагодні агеньчык " Новы год адзначым разам танцам, музыкай і песняй». Вітальныя словы гучалі ад дырэктара Цэнтра, работнікаў і наведвальнікаў аддзялення і ад Дзеда Мароза. Самадзейныя артысты парадавалі прысутных таленавітым выкананнем танцаў і песень, а Дзед Мароз - салодкімі падарункамі, прадстаўленымі грамадскай арганізацыяй – Саветам ветэранаў. Новы год - яркае, загадкавае, непаўторнае, шумнае, дзіўнае свята, якое падарыла ўсім добры настрой.





